ISSN 0023—3102

# Беларуская ДУМКА

6 Беларусская мысль

2004



*Заснавальнік*

**АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**



Выдаецца з кастрычніка 1991 г.

**6**
**чэрвень**

**ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ І ГРАМАДСКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ЧАСОПІС**

У НУМАРЫ:

| Рубрыка | Артыкул | Стар. |
| --- | --- | --- |
| | **Шелехов М.** Вся власть — порядку! | 3 |
| | *Час информации*<br>**Ломсадзе Л.** Здоровье граждан — здоровье нации | 13 |
| | **Вялічка У., Марціновіч А.** Зялёны Астравец над срэбнай Лошай | 23 |
| | **Федаровіч Ч.** I. Годна трымаць марку | 37 |
| | **Вашаева Т.** II. Каб нашы сэрцы маладзелі | 40 |
| | **Кабрынец С.** III. Згода ў доме | 43 |
| *УЛАДА* | **Божанов В.** Во благо народа или бюрократии? | 45 |
| *ЭЎРЫКА!* | По страницам зарубежных журналов | 52 |
| | **Никитенко П., Марков А.** Сфера разума | 57 |
| | **Кадыров М.** Колос весомый и травы густые | 64 |
| *ЭКАНОМІКА* | **Мохнач Г.** Бойтесь продуктов, токсин содержащих | 73 |
| *ФІЛАСОФІЯ І СУЧАСНАСЦЬ* | **Бобков В.** Климат души и почва духа | 80 |
| *АСОБА* | **Локун В.** Вайна — не толькі поле бою | 86 |
| *НАВУКА І ТЭХНАЛОГІІ* | **Булыка Г.** Компьютер под титулом «супер» | 94 |
| *АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ* | **Стражев В., Яковенко Л.** Неподведенные итоги Василия Стражева | 102 |
| *ДУХОЎНАСЦЬ* | **Несцярчук Л.** Зробім сёння — захаваем для нашчадкаў | 110 |
| *СОЦЫУМ: РАКУРСЫ І ГРАНІ* | **Голденков М.** Моя Грушевка | 120 |
| | **Стригалев А.** Следы ведут в Интернет | 125 |
| *ПРАВА* | **Потапович В., Капуцкий А., Курьянович Ю.** Кто он, гражданин ИКС? | 130 |
| *ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ* | **Долготович Б.** Флаги над столицей | 136 |
| *МОМАНТ ІСЦІНЫ* | **Иоффе Г.** Понимание Беларуси: экономика и политический пейзаж | 140 |
| *ПЛАНЕТА І МЫ* | **Примаков Е.** Мир без сверхдержав | 149 |

| | | |
|---|---|---|
| *СПОРТ І ЗДАРОЎЕ* | **Лісоўскі С.** Афінскія рэкорды наперадзе | 153 |
| *ЭКАЛОГІЯ* | **Ипатьев В.** Лес — золото государства | 160 |
| *СВЕТ МАСТАЦТВА* | **Загародні Г.** Марк Фрадкін — родам з Віцебска | 163 |
| *ЛІТАРАТУРА І ЖЫЦЦЁ* | **Ярац В.** *Вершы* | 167 |
| | **Шамякін І.** Партрэт. *Аповесць* | 170 |
| *КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ* | **Антонович И.** Культура и время | 184 |
| | **Базыленка Р.** У душы сваёй у гасцях | 187 |
| *ПОШТА* | **Пациенко Г.** Хула на прошлое — не ваш профиль | 190 |
| | **Губаревич И.** Ключи от счастья | 191 |
| | **Шкляневич Г.** Как Петр «языка» брал | 192 |

Галоўны рэдактар У. П. ВЯЛІЧКА

*Рэдакцыйная калегія:*

У. П. Андрэйчанка, С. П. Вінакурава, С. Н. Князеў, А. А. Марціновіч, Г. А. Махнач, М. У. Мясніковіч, А. В. Праляскоўскі, С. В. Рашэтнікаў, У. В. Русакевіч, М. С. Сташкевіч, І. А. Чарота, У. М. Шымаў, М. М. Шэлехаў, Л. М. Якавенка

*Тэлефоны рэдакцыі:*

галоўнага рэдактара — 232-13-24; першага намесніка галоўнага рэдактара — 232-13-36; намесніка галоўнага рэдактара — 287-16-54; прыёмнай — 232-12-94;

*аддзелаў:* філасофіі, гісторыі і міжнароднага жыцця — 287-18-91; дзяржаўнага будаўніцтва — 287-18-91; эканомікі — 287-19-88; навукі і тэхналогій — 287-16-54; экалогіі і медыцыны — 287-15-82; сацыяльных праблем і права — 287-15-82; адукацыі і маралі — 287-19-88; літаратуры і мастацтва — 232-13-36; мастацкага афармлення — 287-16-54; карэктарскай — 287-17-65; бухгалтэрыі — 287-17-88; факс — 287-17-88

Часопіс выходзіць на беларускай і рускай мовах у залежнасці ад мовы аўтарскага арыгінала. Аўтары апублікаваных матэрыялаў у адпаведнасці з Законам аб друку нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў і звестак. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Перадрукоўванне дазваляецца па ўзгадненню з рэдакцыяй, спасылка на часопіс «Беларуская думка» абавязковая.

Мастацкі рэдактар Н. Ф. Альхоўская
Тэхнічны рэдактар Н. Я. Гарбар
Карэктары: Р. І. Акшэўская, Т. Ф. Архіпенка, Л. П. Жыткавец

Падпісана да друку 26.05.2004
Фармат 70x108¹/₁₆. Афсетны друк. Гарнітура Таймс. Папера афсетная
Умоўна-друк. арк. 16,8. Умоўн. фарбаадб. 17,2. Ул.-выд. арк. 20
Тыраж 4916 экз. Заказ 1128. Цана ў розніцу — 1030 руб.

*Адрас рэдакцыі:* 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Францішка Скарыны, 79.

© «Беларуская думка», 2004





Васіль БЫКАЎ.

*Да 80-годдзя з дня нараджэння Васіля Быкава*

# Вайна — не толькі поле бою

**Валянціна ЛОКУН**
Кандыдат філалагічных навук

Пачаць хочацца з выказвання Уладзіміра Конана: «У найвялікшых канфліктах нашага стагоддзя В. Быкаў удзельнічаў у трох іпастасях: як салдат арміі... як пісьменнік, які стварыў мастацкі аналаг гэтай сусветнай драмы, выявіў “першафеномены” дабра і зла... урэшце, як публіцыст і грамадскі дзеяч, духоўны рыцар нашай Бацькаўшчыны — Беларусі...»[1].

Васіль Быкаў заўсёды быў пісьменнікам індывідуальнага мастацкага бачання, ён імкнуўся раскрыць трагічны сэнс сваёй эпохі і трагічную сутнасць чалавека XX ст. Яго «ваенная» проза скіравана супраць тых твораў, якія «ствараліся па метаду кабінетнага сачыніцельства, без дастатковых ведаў і разумення гісторыі і прыроды вайны, на аснове літаратурных (чытай: газетных)

крыніц, таропкіх гутарак з удзельнікамі партызанскага руху, той або іншай бітвы і г. д.»[2]. В. Быкаў у 50-х — пачатку 60-х гадоў сцвярджаў новую вайну і новага героя, таго героя, якога бачылі самі літаратары-франтавікі, будучы перакананым, што, «каб напісаць пра адчуванні чалавека ў баі, у атацы, трэба самому іх зведаць»[3].

Прозу В. Быкава савецкіх часоў вызначаў найвысокі ўзровень маральнага пачуцця, духоўнасці наогул, што выразна праяўляецца ў абмалёўцы герояў, іх гатоўнасці ахвяраваць сабою ў імя найвышэйшых мэт. Маральна-духоўны крытэрый уваходзіў у вобразны змест лепшых твораў пісьменніка тых часоў, пры гэтым ён мог праяўляцца і ў якасці дыдактычнага імператыву або ў выглядзе лагічных катэгорый («Сотнікаў», «Дажыць да світання»), але найчасцей, як пэўны погляд на жыццё чалавека і грамадства («Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», асабліва «Знак бяды», «Аблава», «Сцюжа»).

Думкі пра высокае прадвызначэнне чалавека, ідэю служэння Радзіме аўтар зрабіў зыходным момантам у ацэнцы герояў. Але ўсё гэта выяўлялася не ў маралізатарскіх сентэнцыях (хоць творчасць 70-х гадоў часткова і вызначаецца менавіта гэтым), а ў праўдзівым адлюстраванні духоўнага развіцця герояў, іх маральных пошукаў. Маральнае пачуццё ў ягоных лепшых творах не адасоблена ні ад эпічнага апавядання, ні ад яго паглыбленага аналітызму і псіхалагізму.

## «Акопная праўда» з рэалістычнай асобай

За летапіс Вялікай Айчыннай вайны В. Быкаў узяўся маючы не толькі свой адметны эмпірычны вопыт, але яшчэ і вопыт беларускай, а таксама рускай і сусветнай літаратур. Як і яго сучаснікі Я. Брыль, І. Мележ, І. Навуменка, І. Шамякін, А. Кулакоўскі і іншыя. Ён ваяваў ужо ўзбагачаны вопытам Л. Талстога. І пісаў таксама ўзбагачаны гэтым вопытам. Л. Талстой за плацдармам Тушына, паводле сведчання В. Быкава, бачыў «усю ваюючую Расію, плацдарм усенароднай героікі, мужнасці, стойкасці»[4]. «Вышыні» ж быкаўскіх герояў сімвалізавалі іх родную Бацькаўшчыну. Яны перадусім былі «выказнікамі» беларускага духу, беларускага менталітэту як аднаго з феноменаў агульначалавечай культуры. В. Быкаў заўсёды вылучаў у класічнай спадчыне «гуманістычныя традыцыі — перш за ўсё вопыт Л. Талстога»[5].

Такім чынам, «акопная праўда», «рэмаркізм» В. Быкава, як і ўвогуле пісьменнікаў «лейтэнанцкай прозы», маюць агульную рэалістычную аснову, «генетычна» яны зыходзяць з аднаго вытоку — «Севастопальскіх апавяданняў» і «Вайны і міра» Л. Талстога.

Адзін з прадстаўнікоў літаратуры «згубленага пакалення» англійскі пісьменнік Р. Олдынгтан адзначаў, што, «каб зрабіць з чалавека ідэальнага салдата, трэба знішчыць пачуцці»[6]. Але герой Р. Олдынгтана, насуперак такому патрабаванню, імкнуўся жыць менавіта пачуццямі. В. Быкаў пачынаў свой летапіс вайны ў аб'ектыванай, стрыманай манеры. Толькі факт, толькі падзея. Але ўсё гэта зусім не азначала, што яго героі не ведалі слабасці або душэўных пакут. Яны таксама жылі пачуццямі. В. Быкаў заўсёды памятаў, што ваюе жывы чалавек, а не аўтамат. Інтэлігент Фішар («Жураўліны крык») пакутуе ад таго, што не можа спадабацца старшыне Карпенку. Васіль Глечык (там жа) плача ад бяссілля і крыўды, сочачы за перадсмяротнымі пакутамі старшыны, тыя ж слёзы крыўды і бязмежнага адчаю выступаюць на яго твары, калі ён страляе ў Аўсеева і нарэшце забівае яго.

В. Быкава цікавіла не столькі вайна як падзея, колькі псіхалогія асобы, ён засяроджваўся на паводзінах чалавека на вайне. «Здаецца,— скажа І. Дзядкоў,— усё мастацтва В. Быкава заключаецца ў адасабленні і аналізе крытычных сітуацый як вузлавых для разумення чалавека на вайне, чалавека наогул»[7].

Метадалагічна В. Быкаў блізкі да Э. Хемінгуэя (і не столькі як да аўтара «Бывай, зброя», колькі да яго пазнейшага — «Па кім звоніць звон»), блізкі да А. Барбюса, Э. Рэмарка, Р. Олдынгтана, Дос Пасаса. Агульным для ўсіх іх з'яўляецца адлюстраванне вайны як асабліва ненармальнага, ненатураль-

нага стану жыцця. Не мае значэння, што А. Барбюс і Э. Рэмарк больш увагі ўдзялялі «пачуццёваму» вобразу вайны, а Р. Олдынгтан яе маральным і псіхалагічным вынікам.

Вайна 1941—1945 гг. для герояў В. Быкава канца 50—80-х гг. была духоўнай неабходнасцю. Яны з'яўляліся часткай свайго народа і часткай той зямлі, якую баранілі. Народа — як нацыі. І зямлі — як духоўнага пачатку. Такім чынам, і катэгорыя народа, і катэгорыя зямлі ўзняты В. Быкавым да катэгорый філасофскіх. У гэтым істотнае адрозненне прозы В. Быкава ад прозы пісьменнікаў «згубленага пакалення». І нават ад рамана Э. Хемінгуэя «Па кім звоніць звон» — найбольш блізкага па ідэйна-маральных вырашэннях асобы чалавека на вайне беларускаму пісьменніку. Роберт Джордан, герой Э. Хемінгуэя, змагар за ідэю. Ён ваюе за Іспанію з маральных меркаванняў. Ён не частка той зямлі, на якой ваюе, не звязаны з ёю духоўна.



З Яўгеніяй ЯНІШЧЫЦ. 1981.

Для В. Быкава вайна — не толькі «поле бою», або трагічная прастора, трагічная і небяспечная адначасова, але і эксперымент духу. Высокага духу. В. Быкаў неаднойчы падкрэсліваў неабходнасць звароту літаратуры да асобы чалавека, які апынуўся ў самых незвычайных, нестандартных сітуацыях вайны. Пры гэтым асноўнымі для яго прозы заставаліся праблемы выбару і маральнай адказнасці чалавека (таму што выбар — гэта заўсёды адказнасць). Яны — ідэйны стрыжань яго твораў.

Чалавеку першай сусветнай вайны цяжка было процістаяць магутным разбуральным сілам гісторыі, вайне як разбурэнню абсалютнаму — і фізічнаму, і духоўнаму, і ён часцей за ўсё або падпарадкоўваецца (Э. Рэмарк), або гіне з адчайным усведамленнем сваёй трагічнай асуджанасці (Р. Олдынгтан), або замыкаецца на сваім унутраным «я», заключае «сепаратны мір» з гэтымі сіламі (Э. Хемінгуэй). Герой вайны В. Быкава таксама вымушаны падпарадкавацца, але перш чым саступіць, «здацца», ён, як слушна заўважыў І. Дзядкоў, «зробіць усё, што ў яго малых сілах, каб адстаяць засвоеныя ім раней маральныя нормы, якой бы ўтапічнай лухтой яны ў дадзены момант не здаваліся»[8]. Гуманізм прозы В. Быкава савецкіх часоў трымаўся на веры ў чалавека. Таго Чалавека, які, «нягледзячы ні на што, становіцца вышэй за свой лёс і, значыцца, вышэй за магутную сілу выпадку»[9].

Праўда В. Быкава ў тым, на думку В. Бурана, што ён «асэнсоўвае вайну ў двух планах — канкрэтна-гістарычным і агульначалавечым...»[10]. І гэтым сваім агульначалавечым, гуманістычным

планам ён збліжаецца з сусветнай ваеннай прозай, аўтары якой пільна ўглядваліся найперш у глыбіню чалавечых пакут на вайне.

## Свой «дом» — як трывалая апора

На пачатку 90-х гг. В. Быкаў, звяртаючыся да праблемы нацыянальнага ў культуры, адзначаў: «Патрыятызм, нацыяналізм, касмапалітызм — паняцці, якія цесна судакранаюцца і часта выцякаюць адно з аднаго. Мяркую, што здаровы, памяркоўны нацыяналізм — з'ява зусім нармальная. Нацыянальнае пачуццё даецца чалавеку, напэўна, ад нараджэння. На аснове менавіта гэтых пачуццяў створана нацыянальная культура народаў і шмат што іншае. Відавочна, нацыянальная ідэя — адна з самых старажытных і самых моцных жыццятворных ідэй, што дайшлі да нашага часу. Яна жывіць шматлікія сучасныя дэмакратычныя дзяржаўныя ўтварэнні Еўропы і Азіі»[11].

Нацыянальнай ідэяй прасякнута ўся ягоная творчасць. У яе змястоўнай структуры найбольш важнае месца займае ідэя — сімвал нацыянальнага «дома». «Нацыянальны свет,— адзначае Г. Гачаў,— расце адразу з розных канцоў: і з зямлі, і з неба, з мінулага (паходжанні), і спераду — з мэты, прызвання, якое гнездзіцца ў мары, ідэалах, у клічу — памкненні наперад»[12].

В. Быкаў цікавы ў вырашэнні тэмы народнага «дома» і «дома» нацыянальнага. Для старшыны Карпенкі («Жураўліны крык») яго «дом» — гэта яго даваеннае жыццё, «толькі на ногі ўзняўся, на сваю каляю ўзбіўся, а тут трах-тах — павяло»[13]. Для васемнаццацігадовага Васіля Глечыка (тамсама) яго «дом» — гэта яго шчаслівае маленства, яго маці, «дужа ласкавая, прыгожая і дужая жанчына, з якой усе людзі ў пасёлку абыходзіліся вельмі прыветна»[14]. Ён і паміраe, калі ў яго душы, прарваўшыся з памяці, «шырыліся, грымелі тугой пяшчотныя, дарагія ўспаміны з таго далёкага, што стала ўжо мінулым і такім нясцерпна замілаваным. Як жывая, паўстала ў памяці маці... Успаміналася настаўніца Клаўдзія Якаўлеўна... З'явіўся перад вачыма непаседлівы Алёшка Бондар і з ім — дураслівыя іх забавы...»[15].

Беларус Васіль Глечык гіне, бароначы менавіта свой беларускі дом. Сваім «народным домам» жыве і «калгасны дзядзька» Жаўтых («Трэцяя ракета»), чый дзед быў забіты на японскай вайне, бацька — у германскую, а брат скалечаны пад Халгін-Голам. Паняцце «дома» ў Жаўтых больш складанае. Гэта не толькі яго Кубань, дзе раней ён працаваў «ад зары да зары», «да сёмага поту», дзе цяпер «ой як горача», але і яго жонка Дарка, яго старэйшы сын Дзмітры, дапрызыўнік, «вазьмуць, трапіць у пяхоту, маладое, дурное — у першым-другім баі і пакладзе галаву»[16].

Маркел Іванавіч Жаўтых бароніць менавіта гэты свой «дом», самую трывалую апору ў ягоным жыцці. І разам з тым — народную апору. Тую, якая зямлёй завецца, бо «ад зямлі ўсё. І чалавек. Якая зямля — такі чалавек»[17].

В. Быкаў 80-х гадоў усё больш і больш будзе заглыбляцца ў філасофію «дома», вышукваючы яго нацыянальныя карані. І не толькі нацыянальныя. «Дом» для Сцепаніды Багацька — чужы па дзвюх прычынах. Раней ён належаў пану Яхімоўскаму. Цяпер жа гэты «дом» — яе галгофа, «нязладны для хлебаробства пагорак, асвечаны іх (яе і Петрыка.— *В. Л.*) слязьмі і працай, іх і людскімі пакутамі»[18]. Але ён стаў яе «домам». Усё жыццё яна з Петрыкам несла свой пакутны крыж, гэта быў яе «дом-крыж», які яна без вагання бараніла. Але гэта быў «дом-крыж» і ўсяго беларускага народа — абагульняе сваю думку аўтар «Знака бяды».

Катэгорыя зямлі як катэгорыя духоўная — адна з галоўных частак «дома» В. Быкава. Зямля, прырода ў яго не проста геаграфічная прастора, гэта, кажучы словамі Л. Гараніна, «прамаці ўсяго бачнага і існага»[19], адна з своеасаблівых формаў нацыянальнага косма-псіха-логаса.

У індывідуальным характары героя В. Быкава, як заўважыў М. Тычына, «у час вайны выступілі рысы народныя і агульначалавечыя, у падкрэслена асабістых пачуццях і намерах адкрылася перспектыва доўгатэрміно-



**З Алесем ЖУКОМ. 1986.**

вых мэтаў людства»[20]. А гэта, акрамя ўсяго іншага, ёсць яшчэ і тое, што Г. Гачаў называў «нацыянальным вобразам свету»[21], калі нацыянальны элемент або нацыянальная свядомасць падпарадкоўвае сабе прынцып светапоглядны, ідэалагічны. У характары тых жа Глечыка, Карпенкі, Лазняка, Цярэшкі, Леўчука... і асабліва Сцепаніды Багацька, закладзены рысы не толькі народныя, нацыянальныя, але і агульначалавечыя, «перспектыва доўгатэрміновых мэтаў людства». Абвостранае пачуццё асабістай адказнасці за лёс вайны, за лёс чалавека на вайне, за лёс свайго нацыянальнага «дома» — гэта В. Быкаў 60-х — першай паловы 80-х гг.

Тып быкаўскага героя вайны процілеглы героям літаратуры «згубленага пакалення» — Э. Рэмарка, Р. Олдынгтана, Э. Хемінгуэя, Дос Пасаса і іншых. Ён бліжэй да фолкнераўскай мадэлі чалавека. Надзелены выразнай індывідуальнасцю, герой В. Быкава не ідзе на кампрамісы, гэта «свет-абсалют». Гэта тып цара Эдыпа, пра якога Гегель некалі пісаў: «Самастойны, моцны і цэльны гераічны характар не хоча дзяліць віны і нічога не ведае аб проціпастаўленні суб'ектыўных намераў суб'ектыўнаму дзеянню і яго выні-кам...»[22]. Яшчэ А. Адамовіч пытаўся-сцвярджаў: «Адкуль, з чаго ўзнікаюць у асобным чалавеку матывы ўчынкаў, паводзін, якія відавочна апярэджваюць свой час, якія ветры прыносяць і раскідваюць насенне этыкі, якую так і хочацца назваць "будучай"?»[23].

## Ягоная «этыка будучыні»

Паняцце «этыка будучыні» В. Быкаў найцесна звязваў з ідэяй нацыянальнага «дома». Як базіс і надбудову. Пісьменнік выпрацоўваў сваю адметную «этыку будучыні», этыку, магчыма, ідэальную з пункту гледжання філасофіі сённяшняга дня, нават утапічную. «Цэнтрам» быкаўскай этыкі быў Сотнікаў. Духоўны шлях Сотнікава — гэта адыход ад **«чалавека-ідэі»** (М. Афанасьеў) і набліжэнне да **чалавека рэальнага**. А. Камю некалі сказаў пра свайго героя Мерсо («Чума»): «Гэта адзіны Хрыстос, якога мы заслугоўваем»[24]. Такім Хрыстосам у савецкай ваеннай прозе быў Сотнікаў. Ён і дагэтуль у творчасці В. Быкава з'яўляецца своеасаблівым «святым», трагічным



*Злева направа:* **Барыс САЧАНКА, Міхась МУШЫНСКІ, Васіль БЫКАЎ, Анатоль ГРАЧАНІКАЎ. 1988.**

у сваёй нязломнасці. Сотнікаў ахвярue сваім жыццём, загладжвае свой грэх зусім па-хрысціянску — праз прызнанне сваёй віны, праз пакаянне. Гэта быкаўскі варыянт «суддзі па пакаянні». І ў сваім развіцці ён набліжаецца да канонаў агульнаеўрапейскай этыкі, адпаведна якой, «барацьбу супраць зла, закладзенага ў чалавеку, мы вядзём не з дапамогай суда другіх людзей, а з дапамогай уласнага суда над сабою»[25]. Набліжаецца да А. Камю, які лічыў, што «індывід не ёсць сам па сабе той каштоўнасцю, якую ён імкнецца абараніць. Каб яна з'явілася, патрабуецца не менш, чым усё чалавецтва»[26].

В. Быкаў 90-х гг. ідзе ў глыбіню трансфармаванай сацыяльным жыццём нацыянальнай свядомасці. Ён заглыбляецца ў характар чалавека і выяўляе яго праявы, яго магчымасці ў працэсе жыцця звычайнага, у сітуацыі, калі можна так сказаць, будзённай. У «неваеннай» прозе пісьменніка гэты перыяд можна назваць другім этапам у працэсе збліжэння яго творчасці з экзістэнцыяльнай літаратурай. Першы этап («Сотнікаў», «Дажыць да світання») вызначаўся блізкасцю галоўным чынам на ўзроўні жанравa-структурным, і менш за ўсё змястоўнымі, светапоглядньмі сістэмамі. Другі — характарызуецца ўжо падабенствам больш глыбокім — на ўзроўні разумення асобы чалавека, разумення прыроды чалавека і свету. Тэма адчужанасці асобы ад грамадства, духоўная ізаляванасць, адсутнасць ілюзіі будучыні, ідэя варожасці свету ў адносінах да чалавека — гэтым прасякнуты апавяданні В. Быкава 90-х гадоў: «На Чорных лядах», «Жоўты пясочак», «Сцяна», «Труба», «Камень» і асабліва аповесць «Ваўчыная яма».

Экзістэнцыяльнымі матывамі часткова пазначана і ранейшая аповесць В. Быкава «Аблава» і нават «Знак бяды». Сцепаніда Багацька ў «Знаку бяды» адзначыць, што «нешта ў свеце заблыталася, перамяшалася, зло з дабром, ці адно зло з другім, яшчэ большым злом. Ці, можа, у ёй самой што змянілася — перайначылася, надламілася, спапялела, спрахнула?»[27]. Гераіня пакуль не можа зразумець, асэнсаваць усёй сітуацыі, але добра адчувае, што «так не павінна быць, не па-чалавечы гэта, значыць нешта трэба рабіць»[28].

У «Аблаве» В. Быкаў набліжаецца да адлюстравання сітуацыі чалавека ў свеце безвыходна трагічным — яго Роўба апынуўся ў варожым яму сацыяльным свеце, прымусова пазбаўлены сувязі з іншымі людзьмі. «Мусіць, на-



**Васіль БЫКАЎ і Пімен ПАНЧАНКА. 1989.**

век адышла дабрыня з мінулым часам, на змену ёй паявілася нешта новае — жорсткае і няшчаднае»[29]. Пісьменнік выяўляе вытокі гэтай жорсткасці — «класавая бязлітаснасць». «...Дабрыня мусіць там, дзе справядлівасць і праўда. А дзе класавая бязлітаснасць, жорсткасць вышэй да тых, хто ніжэй, якая там дабрыня!»[30].

У прозе пісьменніка апошніх гадоў да паняцця жыццястраты ўводзіцца паняцце сэнсастраты. Светаўспрыманне пісьменніка афарбоўваецца ў песімістычныя ноты. В. Быкаў адкрые новую для сваёй творчасці тэму абсурду. Паглыбіцца матыў адзіноты чалавека ў свеце. Адзіноты, якая набывае формы трагічнай раз'яднанасці са светам — «Ваўчыная яма», «Сцяна», «Труба», «Камень».

■

В. Быкаў стварае галоўным чынам у межах рэалістычнай паэтыкі. І гэта паспрыяла яму выпрацаваць сваю адметную мадыфікацыю жанру аповесці, «чыста» быкаўскую, у якой традыцыі рэалістычнай эстэтыкі складана сінтэзаваліся з інтэлектуалізмам, разумовым пачаткам, мастацкім канструяваннем рэчаіснасці і асобы, канструяваннем іх узаемасувязей і ўзаемадачыненняў. Але Быкаў-пісьменнік рэалізаваўся ў беларускім моўным мысленні, у атмасферы беларускай духоўнасці.

Творчасць В. Быкава актыўна садзейнічала беларускай літаратуры спраўдзіцца ў асяродку вялікіх літаратур свету — як літаратуры паўнавартаснай, жывой, унікальнай. Проза пісьменніка, нібыта наноў «сінтэзавана», вяртала літаратуры, нацыянальнай і сусветнай, мастацкія традыцыі Л. Талстога, Ф. Дастаеўскага, М. Гарэцкага, К. Чорнага, Э. Хемінгуэя, А. Камю, Ж.-П. Сартра — вялікіх пісьменнікаў, якія сваёй творчасцю неслі свету ідэі высокай духоўнасці, годнасці чалавека, яго сумленнасці, маральнай адказнасці і высокай самаахвярнасці. В. Быкаў разам з еўрапейскімі пісьменнікамі імкнуўся сцвердзіць тыя агульначалавечыя каштоўнасці, якія былі прыдатнымі для ўсіх часоў: Гамера і Шэкспіра, Л. Талстога і Ф. Дастаеўскага, Томаса Мана і Габ-



**Сярод курсантаў. 1982.**

рыэля Гарсія Маркеса, Уільяма Фолкнера і Джэймса Джойса. В. Быкаў, як адзначыў М. Тычына, «унутрана злучаў сучасную літаратуру з «залатым векам» Л. Талстога і Ф. Дастаеўскага і з векам наступным, прыход якога няўхільна блізіцца і абяцае шмат новага і нязведанага»[31].

ЛІТАРАТУРА


1 Крыніца. 1996. № 3. С. 25.
2 Б ы к а ў В. Праўдай адзінай. Мн. 1984. С. 7.
3 Тамсама. С. 8.
4 Тамсама. С. 10.
5 Вопросы литературы. 1965. № 5. С. 27.
6 О л д и н г т о н Р. Собр. соч.: В 4-х т. Т. 1. М. 1988. С. 279.
7 Д е д к о в И. Василь Быков. Повесть о человеке, который выстоял. М. 1990. С. 89.
8 Тамсама. С. 129
9 Б ы к а ў В. Зб. тв.: У 6-ці т. Т. 2. Мн. 1992. С. 369.
10 Б у р а н В. Васіль Быкаў. Мн. 1976. С. 113.
11 Б ы к а ў В. На крыжах. Выступленні, артыкулы, інтэрв'ю. Мн. 1992. С. 263.
12 Г а ч е в Г. Национальные образы мира. // Вопросы литературы. 1987. № 10. С. 161.
13 Б ы к а ў В. Зб. тв.: У 6-ці т. Т. 1. С. 60.
14 Тамсама. С. 63.
15 Тамсама. С. 103.
16 Тамсама. С. 126.
17 Тамсама.
18 Тамсама. Т. 4. С. 126.
19 Г а р а н і н Л. Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры XX стагоддзя. Мн. 1996. С. 9.
20 Т ы ч ы н а М. Адна праўда застанецца. // Быкаў В. Зб. тв.: У 6-ці т. Т. 1. С. 11.
21 Г а ч е в Г. Национальные образы мира. // Вопросы литературы. 1987. № 10.
22 Г е г е л ь. Сочинения. Т. 12. Лекции по эстетике. Кн. 1. М. 1938. С. 192.
23 А д а м о в и ч А. Ничего важнее. // Вопросы литературы. 1983. № 3. С. 106.
24 К а м ю А. Избранное. М. 1989. С. 11.
25 Ш в е й ц е р А. Культура и этика. М. 1973. С. 313.
26 К а м ю А. Бунтующий человек. // Вопросы литературы. 1980. № 2. С. 130.
27 Б ы к а ў В. Зб. тв.: У 6-ці т. Т. 4. С. 142.
28 Тамсама.
29 Тамсама. Т. 5. С. 417.
30 Тамсама.
31 Т ы ч ы н а М. Адна праўда застанецца. Т. 1. С. 22.


**Фота Уладзіміра КРУКА**

П і н с к